Адкрыты ліст вядомых кінематаграфістаў – на 3-4-й стар.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

№ 76 (4431)

27 верасня 2019 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Народная Воля

ОФИЦИАЛЬНАЯ ПОЗИЦИЯ

Александр ЛУКАШЕНКО: «Сейчас мы суверенны и независимы. Я что, опять под плетку должен кому-то белорусов отдать? Не настолько я держусь за это кресло, чтобы сдать страну»

Президент Беларуси Александр Лукашенко считает, что вокруг темы интеграции Беларуси и России слишком много досужих и неправильных разговоров. Об этом он заявил вчера ня на встрече с представителями украинских СМИ.

«Слишком много не только досужих, но абсолютно неправильных, неточных разговоров вокруг обсуждения наших интеграционных процессов с Россией. Все опасаются. А чего опасаются? Мы есть суверенное, независимое государство. Не меньше, чем Украина. Да, на нас влияет Украина, Польша в разной степени. Балтийские страны в меньшей степени. В большей – Российская Федерация. Мир взаимозависимый», – отметил глава государства.

«Мы суверенны и независимы. Это наше право, как выстраивать эту политику, – подчеркнул белорусский лидер. – *Мы как есть суверенны, так и будем суверенны. Мы будем только укреплять суверенитет и независимость, чего бы нам это ни стоило».*

Александр Лукашенко в этом плане рассказал подробности своих переговоров с Президентом России Владимиром Путиным: *«Мы когда с Владимиром Путиным обсуждали эту проблему (я ее поднял), я ему прямо сказал: «Если у вас в правительстве или у тебя мысль о том, что мы можем войти в состав России или как-то объединиться с Российской Федерацией в одно государство, – выбрось это из головы».*

Президент пояснил, чем обусловлена такая его позиция: *«Чисто эмоционально: я первый Президент в истории независимого и суверенного государства. Скажите, я что, первый Президент для того, чтобы построить это государство и куда-то его включить? Внутрь какого-то государства?.. Нет!»*

По словам Александра Лукашенко, российский Президент заверил его, что такого намерения нет. *«Он говорит: «Да Господь с тобой, у нас даже нет мысли такой». Такой был ответ»*, – рассказал белорусский лидер.

Президент добавил, что некоторые и в Беларуси его упрекают в том, что он якобы намерен сдать суверенитет и независимость. *«Глупость полная. Плевать мне на мою эту власть. Я 25 лет Президент, и я что, на 26-м году своего президентства должен поставить крест не только на независимой Беларуси, но и вообще на мечтании белорусов, которые веками мечтали быть независимыми?»* – заявил он.

«Сейчас мы суверенны и независимы. Я что, опять под плетку должен кому-то белорусов отдать? Не настолько я держусь за это кресло, чтобы сдать страну. Это мое убеждение», – подчеркнул белорусский лидер.

Резюмируя, он призвал не настораживаться по поводу ведущихся между Беларусью и Россией переговоров об интеграции.

(БЕЛТА.)

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Надзея САЛАЎЁВА: «Буду балатавацца ад Партыі БНФ...»



50 сябраў Партыі БНФ будуць удзельнічаць у сёлетняй выбарчай парламенцкай кампаніі. Сярод прэтэндэнтаў у кандыдаты Надзея Салаўёва – перакладчык з Магілёва, маці вядомай на ўсю краіну Ялінкі Салаўёвай, якая на працягу некалькіх гадоў адзіная навучалася па-беларуску ў 380-тысячным Магілёве.

– Як узнікла ідэя ісці ў парламент? Усё ж такі, пагадзіцеся, вы чалавек непублічны? – запыталіся мы ў Надзеі.

– А вам як адказваць – па шчырасці ці правільна? – пажартавала яна. – Удзельнічаць у выбарах прапанавала кіраўніцтва партыі. Я, канешне, не адразу пагадзілася, бо жыву ў рэальным свеце і разумею, як у нас адбываюцца выбары. Але пачала думаць, разважаць: а чаму не? Я – патрыёт Беларусі, я падзяляю каштоўнасці Партыі БНФ. Мой муж таксама яе сябра...

Час ад часу мяне бянтэжыць тое, што адбываецца ў нашай адукацыі. Апошнім часам вельмі кранула тэма незалежнасці, уваскрослая ідэя Саюзнай дзяржавы, так званы новы этап інтэграцыі Беларусі і Расіі. Чаму народ не ведае, пра што там дамаўляюцца працоўныя групы Расіі і Беларусі?! Хочацца пра гэта казаць, каб улада разумела, што людзей гэта хвалюе і што недапушчальна аб такіх сур'ёзных рэчах дамаўляцца кулуарна. Прынамсі, я выкажу сваю пазіцыю. Хто захоча – далучыцца. Буду вельмі рада, калі хтосьці пажадае прыйсці ў маю каманду.

– Вы актыўны сябра партыі? Вас у горадзе ведаюць?

– Мяне больш ведаюць па жаночым лідарстве, у мяне ёсць ініцыятыва «Жанчына ў бізнесе. Як распачаць сваю справу». Чытаю лекцыі, ладжу трэнінгі, семінары, у сацыяльных сетках вяду працу.

– Для многіх вы перш за ўсё маці беларускамоўнай вучаніцы Ялінкі Салаўёвай. Балатуецеся ў горадзе, дзе сёння па-беларуску вучыцца ўсяго 19 дзяцей.

– Вы лічыце, што мала?

– Калі параўноўваць з гадамі вучобы Ялінкі, то і нямала – у 19 разоў болей. Але ж гэта ўсё роўна кропля... У мяне пытанне: на падтрымку каго ў рускамоўным Магілёве разлічваеце?

– Сёння, на жаль, мы жывём у такіх рэаліях, што мовай сапраўды карыстаецца мала беларусаў, але я думаю, што прагрэсіўных, інтэлігентных людзей, для якіх і мова, і гісторыя, і незалежнасць Беларусі – вялікія каштоўнасці, шмат, і ў Магілёве таксама. Магчыма, наш рэгіён адрозніваецца ад заходніх, нават на заробкі нашы людзі едуць не на Захад, а ў Расію, але жыць годна хочуць усе... Мне, канешне, вельмі хацелася б, каб падлік галасоў быў чэсны, празрысты, каб кожны кандыдат у дэпутаты ведаў сапраўдную колькасць сваіх прыхільнікаў... А людзей, якія маю пазіцыю падзяляюць, нямала.

– Подпісы для рэгістрацыі ўжо пачалі збіраць?

– А я і не буду збіраць, буду балатавацца ад партыі. На жаль, няма часу, але хацелася б самой пастаяць з калегамі ў пікетах, пакантактаваць з людзьмі. У мяне прыватная фірма – курсы англійскай мовы па аўтарскай методыцы, я сама сябе кармлю. Раней было па два курсы слухачоў, а сёлета – тры. Попыт на англійскую мову павялічыўся, людзі не ўтойваюць, што збіраюцца з'язджаць з краіны...

Кожныя выхадныя ездзім у Мінск, да Ялінкі. Яна пакуль не можа адаптавацца ў новым асяродку – у ліцэй яна прыйшла ў калектыў, які ўжо склаўся, патрабуецца час, каб прызвычаіцца. І мы, бацькі, мусім ёй дапамагаць маральна, псіхалагічна.

– Надзея, а калі ўявіць, што вы дэпутат Палаты прадстаўнікоў...

– Магу ўявіць, хаця за плячыма няма досведу работы, скажам, у мясцовым Савеце. Думаю, што магла б займацца пытаннямі адукацыі, бо за тыя гады, што Ялінка вучылася ў школе, я дасканала паглыбілася ва ўсе праблемы і хібы сярэдняй школы.

– Вы і сама настаўнік паводле адукацыі?

– Так, настаўнік замежнай мовы, скончыла Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт.

Марыя ЭЙСМАНТ.

На здымку: Надзея Салаўёва з дачкой і мужам.

Фота Радыё Свабода.

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

«За Давыдзьку падпісвацца?! За гэтага нацыяналіста?..»

Карэспандэнт "Народнай Волі" пабываў у пікеце, дзе збіралі подпісы за дзеючага старшыню праўладнай арганізацыі "Белая Русь".

Старшыня грамадскага аб'яднання «Белая Русь» і былы кіраўнік «Белтэлерадыёкампаніі» **Генадзь Давыдзька** зарэгістраваў сваю ініцыятыўную групу ў Мінску па Усходняй выбарчай акрузе №107. Адным з яго апанентаў будзе лідар руху «За Свабоду» **Юрась Губарэвіч**.

Дарэчы, парламент для Давыдзькі – гэта не нешта новае, двойчы ён ужо абіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў. Зараз – трэцяя спроба атрымаць мандат.

...У прыёмнай "Белай Русі" мне паведамляюць, што *"днём пікетаў няма, бо людзі працуюць"*, а збіраць подпісы за Генадзя Давыдзьку пачынаюць у будныя дні ў Мінску ў 17.00. Называюць некалькі адрасоў на Лагойскім тракце.

17.00. Лагойскі тракт, 7. Магазін "Суседзі". Ля ўваходу няма ніякага пікета. Чакаю дзесяць хвілін, але і за гэты час ніхто не з'яўляецца. Халтураць таварышы!

Пехатой шыбую да наступнага пікета і на Лагойскім тракце, 31 знаходжу чатырох маладых людзей пад сцягамі "Белай Русі" і ў куртках грамадскага аб'яднання.

17.30. У пікеце – чатыры чалавекі. Кіруе групай Сяргей Харытановіч, які выкладае ў БНТУ маркетынг. Разам з ім – тры студэнты.

– За паўгадзіны ніводнага подпісу не сабралі, – кажа Сяргей Аляксеевіч і адразу ж робіць выснову: – Як я разумею, усё ад надвор'я залежыць, а сёння яно не вельмі добрае. Хаця, шчыра скажу, народ палітыкай асабліва не цікавіцца.

– У сярэднім за дзве гадзіны пікета 4–5 подпісаў атрымліваецца сабраць, – дадаюць студэнты.

17.37. З боку аўтобуснага прыпынку наўпрост да пікета хуткім крокам рушыць жанчына і ставіць першы подпіс за кіраўніка "Белай Русі". Перадвыбарную праграму Давыдзькі на агітацыйным стэндзе яна не чытае, адразу бачна, што чалавек ужо ведае, дзе і за каго яму трэба было падпісацца.



– Чаму паставілі подпіс за гэтага прэтэндэнта? – цікаўлюся ў жанчыны.

– Таму што сама сябра "Белай Русі", Генадзь Давыдзька – мой лідар, і я галасую за яго.

– А дзе вы працуеце?


– Гэта не мае абсалютна ніякага значэння.

17.45. Да пікета падыходзіць мужчына, які пэўны час глядзіць у вочы плакатнаму Давыдзьку, нешта незадаволена шэпча і адыходзіць, так і не пакінуўшы подпіс.

– Не падабаецца кандыдатура? – цікаўлюся ў яго, і адказ мяне проста шакіруе.

– За Давыдзьку галасаваць?! За гэтага нацыяналіста?.. Ён жа "Белую Русь" узначальвае, а значыць, будзе прасоўваць беларускую мову, хаця 90 працэнтаў насельніцтва ў Беларусі размаўляюць на рускай мове!

– Які ж ён нацыяналіст? – спрабую пераканаць майго суразмоўцу. – Генадзь Давыдзька – былы старшыня Белдзяржтэлерадыёкампаніі, а паглядзіце, якое ў нас тэлебачанне. Амаль цалкам рускамоўнае...



– Ён дзейнічаў у рэчышчы той палітыкі, якую апошнім часам праводзіць дзяржава. Паглядзіце, што творыцца! Рэклама пачала з'яўляцца на беларускай мове, на прыпынках і вакзале стала больш мовы. А я ўсё жыццё на рускай мове размаўляў, хаця нарадзіўся ў Беларусі. З якой мовай нарадзіўся, тая табе і родная. Так што дай Бог здароўя таму Давыдзьку, але гэта не мой кандыдат.

18.07. Да пікета падыходзіць яшчэ адзін мужчына, чытае біяграфію прэтэндэнта.

– Не, за міністра аддаваць голас не буду, – выносіць ён свой вердыкт.

– Генадзь Браніслававіч быў артыстам, а не міністрам, – тлумачаць яму пікетоўшчыкі.

– Ну дык сцяг яму ў рукі! – задаволена кажа дзядзька і таксама сыходзіць, не паставіўшы подпіс.

18.30. Гадзіну правёў у пікеце. Больш сюды наогул ніхто не падыходзіць, не ставіць подпісы і нават не цікавіцца, што адбываецца. Такім чынам, за паўтары гадзіны за Генадзя Давыдзьку падпісаўся ўсяго адзін чалавек.

Побач знаходзіцца яшчэ адзін пікет – дзве настаўніцы школы №34 збіраюць подпісы за свайго дырэктара Святлану Сацукевіч, якая ідзе ў дэпутаты ад Беларускай партыі працы і справядлівасці.

За паўтары гадзіны яны таксама сабралі толькі адзін подпіс, народу няма, а таму дзяўчаты вымушаны выслухоўваць споведзі мужчыны з пляшкай піва, які знайшоў сабе ўдзячных слухачоў. Як трапна сказаў настаўніцам той самы мужчына: "Хутка ўсё закончыцца, трэба пацярпець..."

Алесь СІВЫ.

Фота аўтара.

СКАЗАНА!

Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў: Беларусь падтрымлівае міжнародныя намаганні па забароне ядзерных выпрабаванняў

Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей 25 верасня ў Нью-Ёрку ўзяў удзел у канферэнцыі ў падтрымку ўступлення ў сілу Дагавора аб ўсёабдымнай забароне ядзерных выпрабаванняў.

У сваёй прамове ён выказаў поўную падтрымку нашай краінай міжнародных намаганняў па забароне ядзерных выпрабаванняў.

STOP!

Ініцыятыўную групу графа Прушынскага не зарэгістравалі

Акруговая выбарчая камісія адмовіла ў рэгістрацыі з прычыны недакладных дадзеных аб некаторых сябрах ініцыятыўнай групы.

Аляксандр Прушынскі, які называе сябе графам і вядомы сваімі эксцэнтрычнымі паводзінамі, прадставіў для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы спіс з 11 чалавек. Ён меўся вылучацца па Ваўкавыскай выбарчай акрузе №48. У выніку праверкі высветлілася, што ў траіх сябраў ініцыятыўнай групы аказаліся недакладныя дадзеныя. А паколькі ў ініцыятыўнай групе засталася толькі 8 чалавек, а не мінімальна 10, як патрабуе заканадаўства, то яму адмовілі ў рэгістрацыі.

Са слоў праваабаронцы Рамана Юргеля, які прысутнічаў на пасяджэнні акруговай выбарчай камісіі, недакладнымі дадзенымі палічылі: у першым выпадку з памылкай запісана дата нараджэння сябра ініцыятыўнай групы, у другім – недакладны адрас пражывання, і ў трэцім выпадку высветлілася, што чалавека запісалі ў склад ініцыятыўнай групы без яго ведама.

Прушынскі падаваў скаргу на рашэнне камісіі, але паколькі зрабіў гэта па-за адпаведнымі тэрмінамі, то скарга яго не разглядалася.

Аляксандр Прушынскі 1934 года нараджэння, неаднойчы спрабаваў удзельнічаць у парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбарах.

Міхал КАРНЕВІЧ.

СТАЛА ВЯДОМА

Пахаванне парэшткаў Каліноўскага пройдзе 22 лістапада

Літоўскі сайт Delfi са спасылкай на ўрад Літвы паведаміў, што выяўленыя на гары Гедыміна парэшткі паўстанцаў XIX ст. будуць урачыста пахаваны ў Вільнюсе на могілках Росы 22 лістапада. Падчас урачыстай цырымоніі парэшткі будуць дастаўлены ў Віленскі Кафедральны сабор, а затым перавезены на могілкі Росы.

Віцэ-канцлер ўрада **Дэйвідас Матулёніс** сказаў BNS, што падрабязнае абмеркаванне цырымоніі адбудзецца ва ўрадзе 8 кастрычніка.

«Уся цырымонія пачнецца на Кафедральным пляцы, у саборы мы вырашым, як арганізаваць урачыстую перавозку на Росы, адбудуцца цырымоніі на саміх могілках і ў капліцы. Парэшткі будуць змешчаны ў сімвалічныя маленькія дамавіны і будуць транспартавацца», – сказаў Матулёніс BNS.

Як вядома, пытанне перапахавання парэшткаў Кастуся Каліноўскага падзяліла беларускую грамадскасць. Частка вядомых беларусаў звярнулася да ўрада Літвы з прапановай перапахаваць парэшткі ў Беларусі, другая частка выступіла за Вільнюс.

(Працяг тэмы чытайце на 2-й стар.)

ЧУЛІ?

Дэлегацыю Еўрапарламента па сувязях з Беларуссю ўзначаліў паляк Роберт Бедрань

Лідар польскай партыі «Вясна» і дэпутат Еўрапарламента («Прагрэсіўны альянс сацыялістаў і дэмакратаў») **Роберт Бедрань** абраны 26 верасня кіраўніком дэлегацыі Еўрапейскага парламента ў сувязях з Беларуссю. Дэлегацыя пачне сваю працу падчас першага пасяджэння напрыканцы лістапада.

«Цяпер Еўрапарламент не падтрымлівае двухбаковае парламенцкае супрацоўніцтва з Беларуссю. Аднак парламенцкія выбары пройдуць у краіне ўжо ў лістападзе, а прэзідэнцкія выбары – налета. Я спадзяюся, што гэта створыць новыя магчымасці для паляпшэння ўзаемастасункаў, хоць, вядома, выкананне правоў чалавека ў Беларусі застанецца для нас ключавым пытаннем», – сказаў Бедрань пасля свайго прызначэння.

Сёння ў Еўрапарламенце дзейнічаюць 44 міжпарламенцкія дэлегацыі. Яны будуць займацца сувязямі з парламентарыямі ў іншых краінах, рэгіёнах і арганізацыях. Яны нясуць адказнасць за прасоўванне асноўных каштоўнасцяў Еўрапейскага Саюза: дэмакратыі, павагі да правоў чалавека і асноўных свабод і вяршэнства закона.

Усе дэлегацыі па супрацоўніцтве з краінамі былі створаны ў адпаведнасці з двухбаковымі пагадненнямі паміж ЕС і краінамі-партнёрамі.

100 РАДКОЎ

Міхася СКОБЛЫ

Не валтузьце косці Каліноўскага!

Пісаць электронныя петыцыі стала ледзь не модным заняткам. Зручная і хуткая справа – не ўстаючы з канапы, за пару гадзін можна сабраць сотні подпісаў у падтрымку сваёй ідэі. А ідэі ў паветры лунаюць розныя. Вось і нядаўна ў інтэрнэт-прасторы з'явілася ідэя наконт таго, каб знойдзены ў Вільнюсе прах Кастуся Каліноўскага перапахаваць у Беларусі. Адпаведная петыцыя, доўгі шэраг подпісаў пад якой пачынаецца з імя Святланы Алексіевіч, ужо накіравана ў Сейм Літвы. Удакладню: сярод падпісантаў няма прадстаўнікоў беларускай улады, гэта цалкам грамадская ініцыятыва.

І як афіцыйнаму Вільнюсу на яе рэагаваць? Яшчэ нядаўна грамадская супольнасць Беларусі звярталася да літоўскіх улад з зусім іншай просьбай – каб надмагільны помнік Каліноўскаму ды яго паплечнікам надпісаць па-беларуску. Просьбу, дарэчы, літоўцы задаволілі. І вось новая чалабітная, якая ў Сейме можа выклікаць вясёлую дыскусію. Вы спытаеце – чаму?

Ды таму, што ў петыцыі напісана: «Нацыянальнага героя Кастуся Каліноўскага варта пахаваць у Беларусі, і мы просім літоўскі бок разгледзець такую магчымасць». Я не дэпутат Сейма, але і мне карціць пачухаць патыліцу. Як гэта разумець? З якой гэта пары вышэйшы заканадаўчы орган Літвы займаецца пахаваннямі ў суседняй краіне?

Зрэшты, гэта дробязь. Спадзяюся, пры перакладзе на літоўскую мову дакумент быў падрэдагаваны. А нядробязь – тое, што петыцыя тая ўжо стала чарговым яблыкам разладу ў нашым і так далёкім ад кансалідацыі грамадстве.

Акадэмік Радзім Гарэцкі падпісаўся за пахаванне Каліноўскага ў Беларусі. Зянон Пазьняк выступіў катэгарычна супраць. Доктар гістарычных навук Алесь Краўцэвіч – за, а гэткі ж самы доктар Алесь Смалянчук – супраць. Старшыня ГА «Таварыства беларускай мовы» Алена Анісім – за, а кіраўнік беларускіх масонаў Сяргей Дубавец – супраць… Усчалася нежартоўная валтузня на шкоду ўсім, бо нездарма ж гавораць у народзе: *дзе двух зваду вядзе, там трэці крадзе.*

Гэта ля гарэлачнай крамы лёгка даведацца, хто будзе трэцім. А ля труны, вакол якой ідзе валтузня, той трэці, зрабіўшы сваю чорную справу, прашмыгне незаўважана. Страта выявіцца, ды будзе позна.

Што ці каго мы можам страціць? Нацыянальнага героя №1, чый гераічны вобраз немагчыма аддзяліць ад Святаянскіх муроў, дзе яго арыштавалі, ад Лукішак, на якія ён кінуў апошні пагляд праз мураўёўскую пятлю, ад асвечанай гісторыяй гары Гедыміна, дзе ён праляжаў 150 гадоў. Без усяго гэтага адбудзецца дэсакралізацыя вобраза, што ў дачыненні да нацыянальных герояў рабіць проста недапушчальна.

Літоўскі ўрад сабраўся перапахаваць Каліноўскага на ганаровых могілках Росы, якія ўспрымаюцца і як адзін з нашых некропаляў – там ляжыць нямала вядомых беларусаў. А з месцам у Беларусі не вызначыліся нават тыя, хто падпісаў петыцыю. Адны прапануюць мінскую Кальварыю, другія мястэчка Свіслач (там пахаваны брат героя), трэція – касцёл Святога Роха, чацвёртыя – пахаваць невядома дзе, але так, каб ля магілы маглі сабрацца тысячы людзей... Дыскусія, відаць, яшчэ доўга не аціхне, але ці не пра падобны выпадак сказана ў яшчэ адной прыказцы: *языком у Вільні, а галавой у запечку*?

Бо толькі з «галавой у запечку» можна везці Каліноўскага ў сучасную Беларусь, дзе ўжо гадоў пятнаццаць ідзе санкцыянаваная ўладай яго дэгераізацыя, дзе адказныя за ідэалогію чыноўнікі называюць яго «польскім мяцежнікам», дзе ў школьных падручніках чорным па белым напісана: «Ніякіх аб'ектыўных падстаў для ператварэння Каліноўскага ў нацыянальнага героя не існуе».

Толькі з «галавой у запечку» можна думаць, што над прахам Каліноўскага схіліцца ў жалобе ўлада, якая скасавала ордэн і прэмію яго імя, якая зусім нядаўна выкінула са школьных падручнікаў яго «Мужыцкую праўду» і «Лісты з-пад шыбеніцы».

Толькі з «галавой у запечку» можна ўсур'ёз разважаць пра нейкі зроблены спецыяльна для Каліноўскага прасторны некропаль у краіне, дзе ўся зямля належыць дзяржаве.

А як «галовы ў запечку» думаюць перавозіць парэшткі Каліноўскага праз дзяржаўную мяжу? Чартарным авіярэйсам, якому раптам не дадуць пасадкі ў мінскім аэрапорце? Ці патаемна ў сумцы, запіхнуўшы яе ў багажнік аўто? Ах, якія сенсацыйныя загалоўкі адразу з'явяцца на дзяржаўных сайтах – «Чэрап Каліноўскага стаў кантрабандай!».

Пытанняў – безліч. І адказаў на іх пакуль няма.

То, можа, спачатку варта адказы пашукаць, а потым петыцыі падпісваць?

Мушу далікатна папярэдзіць і літоўскі бок. Наступным разам беларусы могуць папрасіць на вываз Льва Сапегу, які ляжыць у вільнюскім касцёле Святога Міхала. І што тады?

Пакіньма ўсё ж іх парэшткі там, дзе іх паклала сама гісторыя. Пагадзіўшыся з мудрым не па гадах паэтам: «*Сачыцьмуць іх спакой найпільней / муры старой каханай Вільні*».

ЛІЧБА

240 мільёнаў долараў

У такую суму канцэрн «Белнафтахім» ацэньвае страты ад падатковага манеўру за 9 месяцаў. Выніковая лічба за ўвесь год можа быць значна большай, заявіў учора старшыня праўлення канцэрна «Белнафтахім» **Уладзімір Сізоў**. "Тут мноства фактараў, пачынаючы з цаны на нафту і заканчваючы курсамі валют", – адзначыў чыноўнік.

Канцэрн "Белнафтахім" разлічвае, што пэўную кампенсацыю забяспечыць мадэрнізацыя Мазырскага і Наваполацкага НПЗ, якая павінна завяршыцца ў верасні 2020 года.

ДАСЛОЎНА

Нафтапрадукты – праз Літву

«У 2020 годзе плануем нарасціць пастаўкі нафтапрадуктаў праз літоўскія парты. У першую чаргу гэта звязана з іх тарыфнай палітыкай», – сказаў учора намеснік гендырэктара Беларускай нафтавай кампаніі **Сяргей Грыб**, выступаючы на Міжнароднай канферэнцыі «Рынак нафтапрадуктаў і газу Рэспублікі Беларусь. Вытворчасць, трэйдынг, розніца».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Віктар КАРНЕЕНКА:

«Упершыню за 30 гадоў не бяру ўдзелу ў выбарчай кампаніі»



Сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі распавёў Народнай Волі», чаму сёння яму нецікава ўдзельнічаць у выбарчым працэсе.

– У 1989 годзе ў мяне была пераможная кампанія, і пасля я кожны раз так альбо інакш удзельнічаў у выбарах, – кажа **Віктар Карнеенка**. – Чатыры разы вылучаўся ў дэпутаты, у 1995 годзе выйшаў у другі тур, які затым адмянілі. Акрамя гэтага, мяне альбо не рэгістравалі кандыдатам, альбо здымалі з выбарчай гонкі. Таксама браў удзел у кампаніях па назіранні за выбарамі. Але зараз упершыню за 30 гадоў ніякім чынам да гэтага працэсу не маю дачынення. Хаця, калі хтосьці просіць кансультацыі, дапамагаю.

– Чаму прынялі такое рашэнне?

– Па-першае, з гадамі мы не маладзеем. Па-другое, усе тыя прапановы па назіранні, што я рэгулярна ўношу, дэмакратычнымі сіламі не ўспрымаюцца. І я зразумеў, што гэта тупік, калі 15 партый вылучаюць назіраць за выбарамі 2000 чалавек і лічаць, што гэта нармальная сітуацыя.

Я лічу, што галоўныя парушэнні, якія можна зафіксаваць, фіксуюцца толькі падчас падліку галасоў. Усё астатняе – не так важна. Напрыклад, назіральнікі ўбачаць, што прагаласавалі 200 чалавек, а выбарчая камісія скажа, што не 200, а 500. І што з гэтым пасля зробіш? Нічога.

– А што вы прапаноўвалі?

– Я казаў, што неабходна, як дываном, накрываць у краіне ўсе выбарчыя ўчасткі. У Беларусі іх больш за 6 тысяч, у Мінску – каля 700, ва ўсіх абласных цэнтрах разам – каля 1500. Мяркую, гэта не фантастыка, а пад'ёмная для апазіцыі справа – выдаткаваць дзве гадзіны свайго часу, каб паназіраць за працэдурай падліку галасоў. Так, гэта робіцца абсалютна непразрыста, але гэта ўжо будзе лічыцца парушэннем закона.

Акрамя таго, раней на 60 працэнтаў участкаў, дзе мы займаліся назіраннем, бюлетэні з розных скрыняў змешвалі – і тыя, што атрымалі падчас датэрміновага галасавання, і з галасавання дома, і ў асноўны дзень галасавання. Мне зразумела, для чаго гэта робіцца. Бо калі ў асноўны дзень за кандыдата прагаласуюць 3 працэнты, а падчас датэрміновага галасавання 90 працэнтаў выбаршчыкаў, то гэта як мінімум выклікае смех. Гэта таксама трэба фіксаваць.

І апошняе. Назіральнік павінен мець магчымасць атрымаць копію пратакола. Закон дазваляе гэта. Хачу сказаць, што пад пільным назіраннем фальсіфікацыі рабіць складаней. Бо калі арганізавана назіранне толькі на некаторых участках, то затым Цэнтрвыбаркам заўсёды можа сказаць: на агульныя вынікі гэта не паўплывала. А калі абсалютна на ўсіх участках былі парушэнні, то гэта іншая справа. Адным словам, патрэбна назіранне па ўсёй краіне, а яго няма.

– Чым вы зараз займаецеся?

– Living Рознымі прыватнымі справамі. Напрыклад, не так даўно аб'ездзіў могілкі продкаў, прывёў іх у парадак. Таксама займаюся дрэваапрацоўкай, я аматар гэтай справы.

Акрамя таго, з задавальненнем уключыўся ў склад грамадскай рабочай групы, якая працуе над новай рэдакцыяй Канстытуцыі. Асабіста я займаюся пунктам 5, які называецца «Мясцовае самакіраванне».

Магчыма, я яшчэ і паўдзельнічаў бы ў палітыцы, калі б разумеў сэнс свайго ўдзелу і бачыў адзіную стратэгію аб'яднанай апазіцыі. Але ўдзельнічаць у спаборніцтвах пад назвай «Хто больш прыгожа прайграе» не зусім прыемна.

Алесь СІВЫ.

АНОНС

«За правасуддзе без забойства!»

З 5 па 10 кастрычніка ў Беларусі ўжо ў сёмы раз пройдзе Тыдзень супраць смяротнага пакарання.

Распачне Тыдзень супраць смяротнага пакарання, асноўным лозунгам якога будзе **«Правасуддзе без забойства»**, традыцыйны фестываль «Рок за жыццё».

5 кастрычніка адбудзецца канцэрт у Мінску, 6 кастрычніка – у Магілёве. У фестывалі возьмуць удзел папулярныя рок-гурты, якія падтрымліваюць ідэю ўвядзення мараторыя на смяротнае пакаранне: «Крама», Nizkiz, «Петля пристрастия», «Разбітае сэрца пацана», Re1ikt, Luty Sakavik.

Як і ў папярэднія гады, праваабаронцы выйдуць на вуліцы гарадоў, каб распаўсюдзіць спецыяльны выпуск газеты «Народная Воля», які будзе прысвечаны праблеме смяротнага пакарання.

Акрамя гэтага, у Мінску і ў іншых гарадах краіны адбудзецца шмат асветніцкіх мерапрыемстваў на тэму смяротнага пакарання. Вось толькі няпоўны спіс:

– сумесныя мерапрыемствы з фестывалем дакументальнага кіно Watch Docs;

– правядзенне гульняў жывога дзеяння (ларпаў) на тэму смяротнага пакарання разам з «Жывой бібліятэкай»;

– мерапрыемствы з удзелам амбасад замежных дзяржаў у Рэспубліцы Беларусь;

– адукацыйныя мерапрыемствы на пляцоўцы «Тэрыторыя правоў»;

– мерапрыемства разам з Беларускім ПЭН-цэнтрам;

– маладзёжныя дэбаты «ДысКУТ» на тэму смяротнага пакарання.

Арганізатар Тыдня супраць смяротнага пакарання **Андрэй Палуда** адзначае, што вельмі важна цягам Тыдня паказаць, што грамадзянскай супольнасці сапраўды неабыякава праблема існавання ў Беларусі смяротнага пакарання.

*«Мы вітаем любыя арганізацыі і ініцыятывы з усіх куткоў краіны, якія гатовы далучыцца да Тыдня і праводзіць у яго межах свае адукацыйна-асветніцкія і іншыя мерапрыемствы. Калі ў кагосьці ёсць уласныя ідэі ці жаданне правесці нейкую імпрэзу, напрыклад, дыскусію ў навучальнай установе на тэму смяротнага пакарання, і патрэбна дапамога ці кансультацыя экспертаў, смела можна звяртацца да нас. Таксама кожны з нас можа зрабіць самыя простыя рэчы: распаўсюджваць петыцыю за адмену смяротнага пакарання, публікаваць пасты ў сацыяльных сетках з хэштэгамі **#DeathPenalty #AbolitionNow #We4Life2019**. Мы будзем вельмі ўдзячны, бо гэта таксама добры ўнёсак у агульную справу».*

Праваабаронцы запрашаюць усіх далучацца да правядзення мерапрыемстваў у межах Тыдня супраць смяротнага пакарання, якія арганізуе кампанія «Праваабаронцы супраць смяротнага пакарання».

Поўная праграма Тыдня супраць смяротнага пакарання, а таксама афішы асобных мерапрыемстваў будуць апублікаваны на сайце spring96.org.



СОТРУДНИЧЕСТВО

Германским инвесторам нужны государственные гарантии и кредитные страховки, чтобы инвестировать в Беларусь

Вчера в Минске начала работу международная конференция под условным названием «10-й День немецкой экономики в Республике Беларусь». В ней приняли участие министр экономики **Дмитрий Крутой**, посол Федеративной Республики Германия в Беларуси **Манфред Хутерер**, а также государственный секретарь Федерального министерства экономики и энергетики ФРГ **Ульрих Нусбаум**, который перед началом экономического форума встретился с журналистами. Он сказал:

– Германия заинтересована в сотрудничестве, но инвесторам нужны государственные гарантии и кредитные страховки, чтобы финансировать в Беларуси какие-то проекты, нам важна ваша бюджетная политика. У Беларуси должен быть лучший рейтинг в международных организациях и финансовых институтах. Хочу подчеркнуть, что германские предприятия всегда сами решают, где они инвестируют, наше государство в это не вмешивается. Поэтому Беларуси нужно создавать такой экономический климат, который был бы интересен инвесторам. Важно развивать частный сектор, чтобы малый и средний бизнес становился сильнее.

Далее господин У.Нусбаум заметил, что годовой торговый оборот между нашими странами составляет сейчас около 2 миллиардов долларов: Германия – пятый по важности торговый партнер для Беларуси (впереди – Россия и Китай). И если улучшить условия и создать хорошую основу для взаимопонимания, то, заверил У.Нусбаум, можно будет многого достичь.

– Я очень впечатлен – я впервые в Минске. Люди открыты и любезны, город чистый, особенно если сравнить с Берлином. Еще я впечатлен знаниями своих белорусских коллег, с которыми встретился, – сказал государственный секретарь.

На вопрос о том, есть ли уже конкретные проекты в сфере энергетики, Ульрих Нусбаум сослался на министра экономики Беларуси, который сказал, что нашу страну в будущем будут интересовать проекты в области возобновляемых источников энергии. А Германия здесь, конечно, на передовой позиции, особенно, что касается ветряной энергии.

– Беларусь должна четко показать, в каких секторах ей было бы интересно с нами сотрудничать. Поэтому я сегодня здесь и разговариваю с белорусскими министрами экономики, финансов и внешнеполитического ведомства, – подчеркнул Ульрих Нусбаум. – Сейчас происходит большой торговый конфликт между Китаем и США, поэтому германская экономика переориентируется: постепенно уходит с Азии и смотрит больше на европейский рынок. И это шанс Беларуси заявить о себе.

Елена МОЛОЧКО.

ПОЗИЦИЯ

Олег ГАЙДУКЕВИЧ:

«Я от своих слов не отказываюсь...»

Во время рабочей поездки в Кореличский район Гродненской области Александр Лукашенко принципиально высказался за сохранение в стране мажоритарной системы выборов в парламент.

«Мне уже подсовывают предложения парламент избирать по партийным спискам, – цитировали Лукашенко медиа. – *Вы будете знать в лучшем случае пять партий и их руководителей. Люди обычно голосуют за лидера. А там по списку уже никто не знает. Они сами поставят там детей, внуков, любовниц, любовников. Всех туда пропишут. Я сказал нет. Мы пока не изжили мажоритарную систему».*

«Народная Воля» поинтересовалась, как на эти слова отреагировал теперешний глава Либерально-демократической партии Беларуси **Олег Гайдукевич**, который не однажды высказывался за переход на пропорциональную избирательную систему.



– Я считаю, что президент высказался исключительно относительно предстоящих парламентских выборов, – *ответил «Народной Воле» Олег Гайдукевич*. – Сейчас у нас очень серьезный избирательный цикл, впереди президентские выборы, нашу страну будут шатать из стороны в сторону, есть много недоброжелателей, которые не хотят, чтобы Беларусь была независимой. И на сегодняшний момент мы не должны ломать ничего в избирательной системе.

Но я был и буду сторонником партийных списков! Да, я согласен, что их можно критиковать. Но и у одномандатной системы недостатков не меньше! И самый главный – что по одномандатным округам один победитель. Вот смотрите: вы набрали 62 процента голосов, а кто-то – 19 процентов, и это тоже большое количество голосов! Пропорциональная избирательная система дает большую альтернативу, она позволяет партиям, набравшим 5–7–20 процентов голосов, иметь свое представительство в парламенте. И это хорошо! И поэтому я сторонник именно этой системы. Это часть нашей партийной программы, ЛДПБ всегда выступала за пропорционально-мажоритарную систему, партийные списки. И мы от этого не отказываемся. Мы будем продвигать эту идею.

Единственное, я согласен с президентом в том, что на сегодняшнем этапе, в этот сложный предвыборный период это нецелесообразно. Ну а дальше никто не сказал, что в Беларуси не будет голосования по партийным спискам.

Будет!

Марина КОКТЫШ.

УТОЧНЕНИЕ

Вместо цифры 9 проскочила 8

В «Народной Воле» за 20 сентября было напечатано письмо кандидата экономических наук Александра Дубовика **«Партий много, а толку?»**. К сожалению, при наборе в обозначении периода, когда происходило формирование политических партий Беларуси, произошла опечатка: в первой дате вместо цифры 9 проскочила 8. Всё предложение следует читать в такой редакции: «Формирование политических партий в Беларуси пришлось на период системного общественного кризиса конца 1980-х – начала 1990-х годов».

Приносим извинения уважаемому автору и читателям.

Редакция.

ЗА ПРАХАДНОЙ

У В'етнаме адкрылі завод па зборцы грузавікоў МАЗ

У цырымоніі адкрыцця ўзяў удзел генеральны дырэктар ААТ «МАЗ» **Валерый Іванковіч.**

Як падкрэсліваюць на заводзе, беларуска-в'етнамскі завод размясціўся ў 40 км ад Ханоя на месцы рысавага поля ў 4,5 гектара. Праект прадпрыемства быў распрацаваны Мінскім аўтазаводам, а ўвасобіць яго ў жыццё дапамагалі в'етнамскія падрадчыкі.

Зборкай беларускіх грузавікоў з в'етнамскім «грамадзянствам» зоймецца сумеснае прадпрыемства «MAZ Asia». Партнёрам Мінскага аўтазавода выступіла в'етнамская кампанія «AuViet Industry», якая паспяхова рэалізоўвае у рэгіёне аўтобусы МАЗ, самазвалы БелАЗ і камплекты «Белшыны». В'етнамцы сфарміравалі 70% статутнага фонду, а МАЗ пакрыў сваю долю (30%) тэхналогіямі і тэхнікай.

Прадукцыйнасць завода – да 3000 грузавікоў у год. На першым этапе тут будуць збіраць 8 мадэляў аўтатэхнікі МАЗ, якія ўжо адаптаваны пад патрабаванні тэхнічных рэгламентаў В'етнама.

ОТКРЫТЫМ ТЕКСТОМ

*Предлагаемая читателям коллективная публикация – крик души известных киномастеров. Желая, чтобы их услышала как можно большая аудитория, они отослали этот материал государственным газетам «**Звязда**» и «**СБ. Беларусь сегодня**». В редакции первой ответили отказом без всяких объяснений. Во второй после некоторых размышлений вместо печатания критической статьи предложили провести «круглый стол» с участием руководителей министерства и киностудии.*

Авторы статьи – за дискуссию всех заинтересованных сторон. Но они прекрасно понимают, что за круглым государственным столом мастера кино не смогут высказать и десятой части того, что содержится в их статье, а потому решили напечатать ее в «Народной Воле», широко предоставляющей свои страницы для публикации острых материалов, в которых излагаются самые разные точки зрения.

НЕ ДАЙТЕ ЕМУ ПОГИБНУТЬ!

О печальных метаморфозах белорусского кино

О состоянии белорусского кино сегодня не говорит только ленивый. В газетных публикациях, выступлениях в электронных СМИ, зрительских откликах на новые фильмы много критики, большей частью справедливой. Есть и такие, где эмоции преобладают над аналитикой, личная обида берет верх над объективностью. Если попытаться обобщить высказанные мнения, резюме будет таким: во времена СССР национальный кинематограф был в состоянии создавать шедевры на уровне мирового кино, в последние годы его уровень снизился до критического, и о былых амбициях приходится забыть. Увы, это так…

Помня о том, что *«из всех искусств для нас важнейшим является кино»* (В.И.Ленин), руководство страны всеми имеющимися у него средствами, как материальными, так и организационными, старается сломать печальную тенденцию. Президент Беларуси Александр Лукашенко неоднократно встречался с кинематографистами, обсуждал с ними назревшие проблемы, высказывал надежду на создание фильма, который в полной мере можно было бы назвать национальным. *«Национальный фильм – это хороший, достойный фильм, в котором отражена душа народа. Нельзя девальвировать это понятие. Кинолента на сюжет из отечественной истории, где актеры говорят по-русски, – это еще не национальный фильм»* (А.Г.Лукашенко, из отчета БЕЛТА о встрече с кинематографистами, сентябрь 2010 года).

Сказать, что усилия государства не дали никакого эффекта, было бы несправедливо. В результате масштабной реконструкции киностудии «Беларусьфильм» здесь созданы хорошие условия для творчества, ей постоянно выделяются дотации – ежегодно закупается от четырех до восьми игровых, до 30 документальных, от восьми и более анимационных фильмов.

Стремясь подобрать руководителя, который, образно говоря, смог бы наполнить старые творческие меха новым вином, Министерство культуры РБ сменило за последние годы пять генеральных директоров киностудии. Вступая в должность, каждый из них публично обещал: еще чуть-чуть, и наконец-то родится фильм, который заявит о Беларуси на весь мир. Однако результаты по-прежнему более чем скромные. Нынешнему руководителю «Беларусьфильма» В.М.Карачевскому можно только посочувствовать: ему придется нести ответственность не только за то, что сделал сам, но и за грехи предшественников.

Вечный вопрос: «Что делать?»

Прежде всего, не уповать на то, что каким-то чудесным образом проблема разрешится сама собой. От святого духа дети не рождаются. Не отсиживаться в цеховых каморках. Разработать стратегию перемен можно, лишь объединив всех, кто причастен к кино, а именно: Министерство культуры, Академию искусств, киностудии, включая негосударственные, телевизионные каналы, кинопрокат, киноведов и кинорежиссеров. Все они разобщены; каждый, как та кошка, гуляет сам по себе. Мобилизующим и аналитическим центром могла бы и должна стать киностудия «Беларусьфильм», именно с ней связаны наиболее яркие страницы истории национального кино, на ней лежит и главная ответственность за его будущее. К сожалению, здесь предпочитают вариться в собственном соку и не выносить сор из избы. Стоило известным режиссерам Дмитрию Зайцеву и Анатолию Алаю, оператору Юрию Елхову, журналисту Игорю Осинскому высказать свои мнения на страницах газеты «Народная Воля», как их обвинили в злостной клевете. «Не сметь свое суждение иметь!» Выходит, жив курилка Молчалин!..

Главная беда современного отечественного кинематографа в том, что им на всех уровнях управляют амбициозные, властолюбивые люди, очень поверхностно представляющие суть кинопроцесса. Мастер задвинут на задворки, его статус понижен до бессловесного рядового исполнителя, которому позволено лишь интересоваться: «Чего изволите?» Но киностудия – не помещичья вотчина, где можно творить чиновничий произвол, а *мини-государство, созданное для зрителей, призванное отражать их интересы, заботиться об их нравственном здоровье.* Если пренебречь этим, надеяться на появление фильмов, на которые, как когда-то, валом валил бы народ, которые не только обеспечили бы коммерческий успех, но и служили бы своей главной цели – *«сеять разумное, доброе, вечное»*, не приходится.

В киношном ремесле, как и в любом другом, есть свои незыблемые законы. Хотите создать табуретку – не забывайте: она должна иметь четыре ножки одинаковой длины и гладкую поверхность для сидения. Хотите создать хороший фильм – позаботьтесь о том, чтобы все без исключения его составляющие: от сценария до звукозаписи – были сделаны на высоком профессиональном уровне и соответствовали творческому замыслу.

В начале было слово

Игровое кино начинается со сценария. Это аксиома. По плохому сценарию хороший игровой фильм не создашь. Его не спасут ни гениальность режиссера, ни выдающаяся игра талантливых актеров. Как ни старайся, получится «табуретка» с укороченной ножкой или гвоздиком в сиденье.

Тема сценария может быть любой, даже самой банальной, но раскрытой неплоско и непошло. Режиссер Владимир Меньшов вспоминает, что сценарий фильма «Москва слезам не верит», удостоенного премии «Оскар», пришлось пробивать с огромным трудом. Художественный совет киностудии «Мосфильм» раз за разом ставил на нем крест, обвиняя сценариста Валентина Черных в потакании обывательским вкусам. Даже когда фильм был снят и начал свое триумфальное шествие по киноэкранам, его отправили в Канны только потому, что он понравился Леониду Брежневу. Но в кулуарах ЦК КПСС и в профессиональном сообществе все были убеждены в громком провале. А тут – триумф! Вывод: мастеру надо доверять, доверие рождает ответственность, укрепляет атмосферу созидания.

Успешный сценарий – это своего рода замысловатый коктейль, ингредиенты которого вплоть до финальных титров должны оставаться загадкой. Если уже с первых кадров ясно, каким будет окончание излагаемой на экране истории, то это не коктейль, а пойло. Взять, к примеру, две наиболее распространенные в нашем кино темы: лав стори и военную драму. Десятки, если не сотни картин сделаны, словно под копирку. Сюжеты примитивные. В первом случае – она бедная, приехала в большой город в поисках счастья и полюбила богатого. Он ею воспользовался и бросил с ребенком. Дальше демонстрируются ее бесконечные страдания в надежде на то, что зритель прольет слезу. И обязательный хэппи энд: находится благородный мужчина, который разрешает все ее проблемы. Подобные мыльные оперы пользуются сегодня успехом лишь у дам преклонного возраста, воспитанных на индийских фильмах. То же самое в изображении войны. Врутся снаряды, строчат пулеметы. Враг силен и коварен. Но в конце концов благодаря мужеству и отваге наших он будет повержен. Даже новейшие технологии, позволяющие творить на экране чудеса (как, например, в фильме «Т-34»), не побуждают больше зрителя хвататься за носовой платок, чтобы утереть слезы, или пить валерьянку. В показе войны надо, как это делали, скажем, Элем Климов и Михаил Пташук, находить такой ракурс-взгляд, чтобы в его основе лежал конфликт, интригующий зрителей своей непредсказуемостью, вовлекающий их в происходящее на экране. А для этого герой картины должен быть незаурядной личностью, а не посредственностью, тупо подражающей суперменам.

Есть ли у нас сценарии, выбивающиеся из заезженных схем? Есть. Конкретный пример. На тендер, что проводит в настоящее время в рамках государственной закупки Министерство культуры РБ, представлен сценарий фильма «Брат мой – враг мой», в основу которого положена малоизвестная, не нашедшая пока отражения в кино история батареи легендарных «катюш» капитана Флерова; как известно, свои первые залпы она произвела под Оршей. В сценарии есть всё: и конфликт братьев-близнецов, ставших в силу драматических обстоятельств врагами, получивших высшие награды Красной Армии и вермахта, и трагическая любовь, и неординарный взгляд на причины коллаборационизма и партизанского движения, и психологический аспект войны сродни тому, что характерен для всех произведений Василя Быкова. Если учесть, что авторы рассказывают о реальных событиях, происходивших в Беларуси и России, в канун 75-летнего юбилея Победы, фильм был бы обречен на успех у зрителей.

Судьбу сценариев определяют люди, представляющие все мыслимые сферы общекультурного процесса, но в большинстве своем далекие от кино. А желательно, чтобы как минимум половину экспертов составляли профессионалы: кинодраматурги, режиссеры, операторы, редакторы, киноведы, продюсеры, актеры, создавшие хотя бы одно заметное произведение, а имена авторов сценариев оставались для экспертов неизвестными до вынесения ими вердикта. Представим себе такую картину: приступает член жюри к чтению, а на титульной странице фамилия классика! Считайте, фора ему уже обеспечена. Скорее всего, эксперт даже не станет дотошно изучать произведения конкурентов, в лучшем случае для очистки совести пробежит их по диагонали. А если имя не классика, а просто *своего человечка*? И к бабушке не ходи, ответ известен!..

Камо грядеши?

По утверждению кинопрокатчиков, большинство фильмов, снятых в последние годы на национальной киностудии, окупают себя только на 5–10 процентов. Лишь единицы дотягивают на телевидении до 75 процентов, да и то в течение трех лет. Это не бесстрастная статистика. Это приговор!

Причина упадка белорусского кино не в отсутствии талантливых сценаристов, кинорежиссеров, операторов. Они есть. Во-первых, несмотря на свой возраст, еще в строю, полны сил и энергии многие из ветеранов, благодаря творчеству которых киностудия «Беларусьфильм» была в числе лучших в СССР; во-вторых, подросла подающая надежды талантливая молодежь.

Подлинная причина лежит гораздо глубже. Мы изменили своим национальным традициям. Поддавшись всеобщему низкопоклонству перед западным кинематографом, предали забвению творческий метод и опыт белорусских, советских мастеров, утратили собственное лицо.

Те, кто сегодня вершит судьбы кино, ссылаются на объективные причины. Всё, мол, изменилось. И нравственные ценности, и критерии творчества, и традиции. Непонятно, правда, как им, традициям, это удалось?!

Если поверить в правдивость и объективность произошедших метаморфоз, получается: вчера ты был бездарь, а сегодня – гений. И наоборот: вчера ты был гений, а сегодня твое мнение никому не интересно, тебе нет места даже в художественном совете киностудии.

В эпоху победившего на постсоветском пространстве капитализма энтузиазм хочет быть хорошо проплаченным, невинность – выгодно проданной! Ум? А кому он нынче нужен, этот ум? Все решает предприимчивость, граничащая с наглостью. Отсюда и полный разворот в определении цели кино. Сегодня главное – не идея, а коммерция. А у нее свои законы: неважно, что продавать, важно – чтобы купили. Приведем вопиющий случай.

Известный режиссер, заслуженный деятель искусств Белорусской ССР, лауреат Государственной премии СССР Вячеслав Никифоров представил на конкурс сценарий игрового фильма для детской и юношеской аудитории «Живодеры» («Прости, собака!»), проповедующий гуманизм, ответственность за тех, кого приручили. На заседании Комиссии по организации и проведению государственных закупок товаров (работ, услуг), которое состоялось 16 июля 2019 года, проект был одобрен, утвержден бюджет. В качестве исполнителя выступало ООО «Первая КиноВидеоКомпания». Но менее чем через месяц, 12 августа 2019 года, министерство кардинально поменяло свое решение, о чем уведомило автора в письме за подписью первого заместителя министра культуры РБ Н.В.Карчевской. В нем говорится (цитируется с сохранением стилистики документа):

«При дополнительном комплексном анализе в структурных подразделениях Министерства культуры актуальности реализации упомянутого кинопроекта выявились обстоятельства, свидетельствующие о миновании надобности в данной государственной закупке и отсутствии необходимости заключения договора на производство фильма.

С учетом изложенного заказчиком принято решение процедуру государственной закупки на оказание услуг по производству фильма в рамках социально-творческого заказа в игровой форме для детской и юношеской аудитории отменить по причине утраты необходимости».

«Утрата необходимости» болезненно оборачивается для талантливого режиссера, загоняет его в состояние длительного творческого простоя, в депрессию.

«Господин Бондарь! – в отчаянии пишет знаменитый режиссер Вячеслав Никифоров министру культуры. – *Отменив без всяких обоснований результат процедуры госзакупки, вы просто размазали меня по стене как мастера. Вы закрыли фильм моей жизни!»*

В подобной ситуации оказался в 2010 году известный кинорежиссер, лауреат Специальной премии Президента РБ «За духовное возрождение», художественный руководитель «Белорусского видеоцентра» Александр Карпов-младший. Получив предложение тогдашнего генерального директора «Беларусьфильма» Владимира Заметалина занять пост художественного руководителя студии игрового кино, согласился не сразу. Зная о царивших на киностудии порядках, боялся лишиться самостоятельности. Но решение было уже согласовано наверху, да и память о почти четвертьвековой работе на «Беларусьфильме» в благополучное советское время взяла верх, искренне захотелось помочь возрождать былые традиции. Практически уже уйдя с прежней работы, узнал о неожиданном отказе от договоренностей. Без объяснений! Без извинений!

К сожалению, пренебрежительное отношение чиновников к мастерам, прославившим белорусское кино, стало в Беларуси уже нормой. Игорь Добролюбов, принесший первую Венецианскую награду родной киностудии за фильм «Иван Макарович», мечтавший обучать мастерству молодых режиссеров, так и не добился до своей смерти в 2010 году права преподавать в Академии искусств. Отлучены от кино выдающийся режиссер Валерий Рыбарев, талантливые Андрей Кудиненко, Александр Кананович, Андрей Курейчик; по сценариям последнего, кстати, в Голливуде и России снимаются фильмы, собирающие баснословную по нашим критериям аудиторию. У нас же все предлагаемые ими сценарии отклоняются без внятной аргументации. Нередко в Бермудский треугольник невостребованности попадают и управленцы высокого ранга, освобождая свои места для менее компетентных, но более нужных кому-то людей. Нынешним летом, например, не продлены контракты с начальником управления по кинематографии Министерства культуры Александром Рыдваном и директором студии игровых фильмов Светланой Ярошевич, чья компетентность у киношников не вызывает сомнений. Таким примерам несть числа…

Трагедия национального игрового и документального кино заключается в том, что подлинные мастера отказываются создавать дешевые поделки и оказываются невостребованными, что равносильно запрету на профессию, а фильмы, снятые на потребу дня, не приносят и никогда не принесут коммерческого успеха.

Не лучшая ситуация и в анимации. Материально-техническая база и кадры студии находятся в плачевном состоянии, поскольку все средства, регулярно поступающие на киностудию «Беларусьфильм» на производство анимационных фильмов, тут же растворяются в «общем котле». Выражаясь бытовым языком, аниматоров просто-напросто пробрасывают, так как они являются «договорниками», что позволяет годами не выплачивать полагающиеся им зарплаты и гонорары. При таком положении дел анимационная студия долго не протянет.

